УДК 342.05(476)(091)

# УСЕБЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ СХОД: ЦІ ВАРТА ШУКАЦЬ ГІСТАРЫЧНЫЯ ПАРАЛЕЛІ?

**В.М. Лянцэвіч**

Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт

*Анатацыя.* У артыкуле даследуюцца гістарычныя перадумовы фарміравання традыцыі народаўладдзя на беларускіх землях; вылучаюцца асобныя органы, каторыя пэўны час дзейнічалі на беларускіх землях і мелі шырокае народнае прадстаўніцтва; робіцца выснова аб унікальным характары Усебеларускага народнага схода.

*Ключавыя словы:* Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, Усебеларускі народны сход, веча, вальны сойм, Першы Усебеларускі з’езд (Кангрэс), Народны (Нацыянальны) сход Заходняй Беларусі, народаўладдзе, грамадзянская супольнасць.

У канцы сакавіка 2024 г. завяршаецца вылучэнне дэлегатаў на Усебеларускі народны сход (далей – УБНС) – орган вышэйшай улады Рэспублікі Беларусь, каторы ўпершыню выступіць у статусе канстытуцыйнага органа па рашэнні IV рэспубліканскага рэферэндума 27 лютага 2022 г. Па выніках выбараў дэлегатаў у канцы красавіка пройдзе першае пасяджэнне Схода ў новым яго фармаце [1]. Такім чынам, мы знаходзімся ў пэўным унікальным прамежку часу, калі ў сістэме органаў вышэйшай улады нашай краіны фарміруецца новы суб’ект, аналагаў якога не сустракаецца ў сучаснай еўрапейскай унутрыпалітычнай прасторы. У міжнародным маштабе падобным органам можна лічыць толькі Усекітайскі сход народных прадстаўнікоў, – вышэйшы заканадаўчы орган улады, замацаваны ў арт. 57–78 Канстытуцыі КНР.

Шэраг публікацый сучасных беларускіх навукоўцаў, каторыя звяртаюцца да праблематыкі УБНС, выводзяць гістарычныя карані інстытута народнага прадстаўніцтва с часоў першых дзяржаваў-княстваў [2–4]. Звяртаючыся да так званага далітоўскага перыяду фарміравання беларускай дзяржаўнасці, калі на тэрыторыі сучаснай Беларусі фармаваліся першыя дзяржаўныя ўтварэнні – “землі”, цэнтрамі каторых з’яўляліся буйныя гарадскія цэнтры – перш за ўсё Полацк, пазней – Тураў, Смаленск і інш. [5, с. 90], зазначым, што ў сістэме органаў улады і кіравання X–XIII стст. значную ролю адыгрывала *веча* – сход дарослых свабодных жыхароў горада, каторы вырашаў шырокае кола пытанняў. Адыйшло ў нябыт сцвярджэнне рускага дарэвалюцыйнага гісторыка В. Ключэўскага, каторы вызначаў веча як новаўтварэнне XI ст., выклікане

ўпадкам аўтарытэту князёў [6, с. 139]. Сучасныя даследчыкі бачаць падвоеную прыроду гэтага інстытута звычаёвага права, які існаваў з дадзяржаўных часоў як улада "грамады" [7, с. 111], класічны элемент самакіравання часоў родапалемяннай арганізацыі ўлады ў першабытным грамадстве [8, с. 3]. З другога боку, ён стаў класічным дзяржаўным органам раннефеадальнага перыяду з даволі шырокімі паўнамоцтвамі. Такім чынам, найперш веча як агульны сход суродзічаў з'яўлялася адзіным суб'ектам улады [8, с. 3]; з другога боку, са з'яўленнем князя можна казаць пра пачаткі дзяржаўнасці на землях усходніх славян (нагадаем, "Аповесць мінулых гадоў" сведчыць аб прызванні ноўгарадцамі Рурыка ў 862 г., тады ж упершыню згадваецца Полацк).

Доктар юрыдычных навук Т. І. Доўнар вызначае розныя назвы, пад якімі згадваўся грамадскі сход: "снем", "сойм", "капа", "купа" [7, с. 111], аднак у даследчыцкай літаратуры замацавалася "веча" (ад старажытнаруск. вѣче, ст.-слав. вѣште – совет). Пільную ўвагу гэтаму найбольш старажытнаму органу ўлады нададзена ў артыкуле беларускага гісторыка пачатку ХХ ст. М. В. Доўнар-Запольскага "Веча" (1910 г.). Даследчык сцвярджае веча як усенародны сход, у каторым мог пры жаданні прыняць удзел любы дарослы, свабодны мужчына-глава сям'і – "усе людзі добрыя" [9, с. 43], які жыў у стольным горадзе, альбо нават у прыгарадзе [5, с. 90]. Пры гэтым сход не меў перыядычнасці і склікаўся па меры неабходнасці "князем, паасобнай асобай і цэлай партыяй" [5, с. 90] для абмеркавання найважнейшых спраў. Месца збору павінна было ўмясціць усіх жадаючых, таму часцей за ўсё знаходзілася пад адкрытым небам – на гандлёвай плошчы, каля царквы (М. Доўнар-Запольскі вылучае дзве лакацыі ў Полацку: каля Св. Сафіі або каля Св. Багародзіцы Старой [9, с. 43]), на паганскім капішчы (дзе, дарэчы, збіраўся і старажытны копны суд).

Беларускі гісторык права Т. І. Доўнар адзначае, што невялікі службовы апарат абумоўліваў імкненне княжацкімі органамі шукаць падтрымкі ў насельніцтва [7, с. 111]. Звычаёвы характар публічнага права раннефеадальнага перыяду не дае магчымасці дакладна вызначыць кола пытанняў, якія выносіліся на ўсенароднае абмеркаванне. З дакладнай доляй вераемнасці можна сцвярджаць, што веча прызывала і зацвярджала кандыдатуру князя, а значыць магло яго "выгнаць" [9, с. 43]; абмяркоўвала пытанні вайны і міру, зацвярджала дагаворы, ажыццяўляла ўнутранае кіраванне, выконвала судовыя функцыі [6, с. 141; 5, с. 90].

Князь лічыўся легітымным, калі яго асобу зацвярджала веча. Сход мог нават выгнаць князя, што неаднаразова адбывалася ў Полацку ў ХІІ ст. [10, с. 268–273]. У той жа час, як слушна зазначае прафесар А. У. Сільчанка, разглядаліся на вечы таксама пытанні, каторыя тычыліся ўнутраных справаў абшчыны, фінансавання грамадскіх патрэбаў (рамонт і пабудова дарог, інш.), і тады яно дзейнічала як орган самакіравання [8, с. 4].

З пункту гледжання савецкіх гісторыкаў, вечавы сход абараняў інтарэсы баяр-землеўласнікаў [11, с. 19]. Аднак сучасныя даследчыкі сцвярджаюць,

што з наступленнем феадальнай раздробленасці (у Полацкай зямлі – з пачатку XII ст.) роля вечавых сходаў ўзрасла [7, с. 111; 11, с. 20; 12, с. 40]. Варта таксама зазначыць, што ў Полацкай зямлі роля веча была нават большай, чым у Кіеве. У той час як ў рэгіёнах Паўночна-Ўсходняй Русі значна большую перавагу мела ўлада князя.

У пачатковы перыяд існавання Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ) былі захаваны ўсе звёны кіравання ўсходнеславянскімі землямі, каторыя функцыянавалі ў раннефеадальных дзяржавах-княствах [11, с. 15]. Вечавыя сходы ў Полацку і Смаленску праіснавалі да XV ст. [5, с. 90; 7, с. 114]. Полацкае веча спыніла дзейнасць у 1498 г., калі горад атрымаў права на самакіраванне [6, с. 142], таму не падаецца мэтазгодным вызначаць пераемнасць веча ў сістэме гарадскога кіравання. На землях Паўночна-Ўсходняй Русі вечавыя сходы перапынілі сваю дзейнасць значна раней, пад час мангола-татарскага нашэсця. Пэўныя элементы вечавога ладу прасочваюцца ў абласных граматах буйных зямель-княстваў у складзе ВКЛ [13, с. 297].

Такім чынам, калі вызначаць ролю веча ў сістэме дзяржаўнай улады і кіравання X–XIII ст., відавочным падаецца яго статус як органа прамога народапраўства, а не прадстаўнічага органа ўлады. Па сцвярджэнні беларускага гісторыка, прафесара Г. Штыхава, калі ў іншых краінах вечавое жыццё трансфармавалася ў зладжаную дзяржаўную ўстанову, то на ўсходнеславянскіх землях гэтага не здарылася [6, с. 141]. Парадак фарміравання і кола паўнамцтваў вечавога схода не даюць падставы сцвярджаць прамую яго сувязь з сучасным УБНС.

Вытокі саслоўнага кіравання на беларускіх землях вызначаюцца з канца XIV ст., калі пасля атрымання Вільняй, толішняй сталіцай ВКЛ, права на самакіраванне (1387 г.) баяры горада выступілі ад імя ўсёй рыцарска-баярскай суполкі, што паклала пачатак збору *шляхецкіх соймаў* [13, с. 297]. З часоў Гарадзельскай уніі (1413 г.) пачалі праходзіць сумесныя з’езды літоўскіх і польскіх баяр. Сходы праходзілі нерэгулярна. Да пачатку XVI ст. на іх маглі прысутнічаць усе жадаючыя землеўласнікі, што, аднак, не азначала роўнасці ўнутры шляхецкага саслоўя, як сцвярджаюць некаторыя даследчыкі [4, с. 78]. Соймы гэтага перыяду можна хутчэй вызначаць як дарадчыя органы, паколькі галоўную ролю ў іх рабоце адыгрывалі вялікі князь і паны-рада, каторыя інфармавалі шляхціцаў аб пэўных рашэннях, а ўдзельнікі сойма павінны былі іх адобрыць і прыняць да ведама [13, с. 298].

Толькі з 1511 г. вызначыўся рух да афармлення прадстаўнічага характару *вальнага сойма*, калі Жыгімонт І Стары загадаў абраць по два прадстаўнікі шляхціца ад кожнага павета. Нарматыўнае замацаванне гэтая тэндэнцыя атрымала ў Віленскім агульназемскім прывілеі 1565 г., паводле каторага ствараліся органы шляхецкага самакіравання – павятовыя соймікі, на якіх абіраліся дэпутаты ў агульны сойм дзяржавы. Пры гэтым варта падкрэсліць, што прыняць удзел у працы сойма маглі князі мясцовых княстваў, каталіцкія і праваслаўныя біскупы, службоўцы цэнтральных і

мясцовых органаў кіравання, а таксама павятовая шляхта. Такім чынам, у першай палове XVI ст. адбываецца паступовая трансфармацыя саслоўнага сойма ў орган саслоўнага прадстаўніцтва. Нарматыўна гэта замацоўваецца ў артыкулах Статута ВКЛ 1566 г. (разд. 3 арт. 5, 6, 12). Статут ВКЛ 1588 г. замацаваў статус сойма ВКЛ ва ўмовах канфэдэрацыі Рэчы Паспалітай (разд. 3 арт. 6, 7, 8, 9) як органа прадстаўніцтва шляхецкага саслоўя. Такім ён праіснуе да канца XVIII ст., калі паводле рэформаў Чатырохгадовага сойма (1788–1792 гг.) да ўдзелу ў сходзе будуць дапушчаны гаражане. 23 лістапада 1793 г. у выніку другога падзелу скончыў сваю работу апошні вальны сойм Рэчы Паспалітай.

Такім чынам, вальны сойм ВКЛ – аднасаслоўны выбарны шляхецкі орган, каторы нельга назваць органам народнага прадстаўніцтва.

Толькі напрыканцы 1917 г., пасля прыходу ў Расіі да ўлады партыі бальшавікоў, адбыўся сход, які па назве і пэўным складзе можа выклікаць паралель з сённяшнім УБНС. Гэта *Першы Усебеларускі з’езд (Кангрэс)*, які праходзіў з 5 па 17 снежня 1917 г. у Мінску, сабраў 1872 дэлегаты, 1167 з якіх мелі права вырашальнага голасу, а 705 – дарадчага. Склад дэлегатаў фарміраваўся з прадстаўнікоў ад губернскіх, павятовых і валасных земстваў, губернскіх павятовых самакіраванняў, губернскіх і павятовых зямельных камітэтаў, губернскіх арганізацый паштова-тэлеграфных служачых, дарожных камітэтаў, губернскіх і павятовых настаўніцкіх арганізацый, саюза земскіх служачых, беларускіх бежанскіх і беларускіх нацыянальных арганізацый (па адным на губерню), салдат войску, флоту і тылу (па адным на 500 чал., з ліку беларусаў), Саветаў працоўных і салдацкіх дэпутатаў (па адным на павет), а таксама членаў выканаўчых органаў БАК, ВБР, ЦБВР і выканаўчага бюро з’езда беларусаў у Маскве. З дарадчым голасам ўдзельнічалі прадстаўнікі розных палітычных партый, у тым ліку і нацыянальных (яўрэйскіх, польскіх, літоўскіх) [14, с. 67]. Такім чынам, з’езд быў вельмі прадстаўнічы і правамоцны вырашаць пытанні аб самавызначэнні Беларусі [15, с. 259]. Сумнавядомы лёс гэтага прадстаўнічага усебеларускага форуму: разгон сіламі Абласнога выканаўчага камітэта Заходняй вобласці і фронта, пры тым, што прыняты быў толькі першы пункт рэзалюцыі аб стварэнні часовага органа краёвай улады – Усебеларускай рады сялянскіх, рабочых і салдацкіх дэпутатаў.

Увогуле ж з’езд планаваў прыняць рашэнне аб скліканні Устаноўчага сходу, каторы павінен быў вырашыць пытанне аб уладзе на Беларусі. Такім чынам, Першы Усебеларускі з’езд стаў аднаразовым сходам, з вельмі шырокім народным прадстаўніцтвам, абраным з шырокага кола грамадскіх суполак, які не планаваў збірацца на пастаяннай аснове.

Яшчэ адзін эпізод дзейасці прадстаўнічага сходу для прыняцця важкіх дзяржаўных рашэнняў – *Народны (Нацыянальны) сход Заходняй Беларусі*, з выбарных па абласцях Заходняй Беларусі (ваяводствы Навагрудскае, Віленскае, Беластоцкае, Палескае). Асноўнай мэтай схода было прыняцце рашэння аб уключэнні заходнебеларускіх зямель у склад Беларускай ССР,

якое стала магчымым пасля паходу Чырвонай Арміі на Польшчу напачатку Другой сусветнай вайны. Выбары, у каторых мелі права ўдзельнічаць усе жыхары, якія дасягнулі 18-гадовага ўзросту, прайшлі 22 кастрычніка 1939 года. Кандыдаты ў дэпутаты Народнага сходу вылучаліся сялянскімі камітэтамі, часовымі ўпраўленнямі, сходамі працоўных на прадпрыемствах, сходамі рабочай гвардыі і інтэлігенцыі [15, с. 329].

Сход у складзе 927 абраных дэпутатаў пачаў работу 28 кастрычніка 1939 г. у Беластоку і за тры дні прыняў дэкларацыі "Аб дзяржаўнай уладзе" (абвяшчала ўсталяванне савецкай улады на заходнебеларускіх тэрыторыях); "Аб уваходжанні Заходняй Беларусі ў склад БССР"; "Аб канфіскацыі памешчыцкіх зямель" (абвяшчала дзяржаўную ўласнасць на зямлю); "Аб нацыяналізацыі банкаў і буйной прамысловасці" (абвяшчала перабудову народнай гаспадаркі на сацыялістычнай аснове).

Дэкларацыі Народнага сходу Заходняй Беларусі сталі прававой асновай для прыняцця 2 лістапада 1939 г. Вярхоўным Саветам СССР пастановы "Аб уключэнні Заходняй Беларусі ў склад Саюза ССР з уз'яднаннем яе з Беларускай ССР". Адпаведная пастанова Вярхоўнага Савета БССР была прынята 14 лістапада 1939 г.

Усебеларускі народны сход суверэннай Беларусі як агульны сход прадстаўнікоў беларускага ўрада, кіраўнікоў прадпрыемстваў і прадстаўнікоў іншых галін гаспадаркі пачаў збірацца з 1996 г. з перыядычнасцю адзін раз у пяць гадоў. Пачынаючы з II схода колькасць удзельнікаў дасягала 2500 чалавек. Асноўнай задачай схода ў 1996–2021 гг. з'яўлялася прыняцце "Асноўных накірункаў сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь" на 5-гадовы перыяд. Працэдура адбору дэлегатаў на Усебеларускі народны сход I–VI склікання падавалася непразрыстай [16].

Такім чынам відавочна, што органа ўлады, адпаведнага замацаванаму ў апошняй рэдакцыі Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, у беларускай гісторыі не сустракаецца. З аднаго боку, гэта прадстаўнічы орган улады, з другога – орган народаўладдзя. Канстытуцыйны статус Схода замацаваны ў арт. 89 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь апошняй рэдакцыі. Таксама дзейнічае Закон Рэспублікі Беларусь "Аб Усебеларускім народным сходзе" ад 7 лютага 2023 г. № 248-З. УБНС адзначаецца як *вышэйшы прадстаўнічы орган народаўладдзя* Рэспублікі Беларусь, што вылучае яго з ліку іншых органаў улады Беларусі, я сучасных, так і папярэдніх.

Сярод пералічаных у арт. $89^2$ Канстытуцыі складнікаў дэлегатаў Схода варта вылучыць прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасці. Адначасова з арганічным законам аб УБНС год таму з'явіўся Закон "Аб асновах грамадзянскай супольнасці" ад 14 лютага 2023 г. № 250-З, у каторым суб'ектамі грамадзянскай супольнасці названы "… аб'яднанні грамадзян або юрыдычных асоб на аснове членства незалежна ад колькаснага, тэрытарыяльнага або іншага цэнзу, статутная дзейнасць якіх накіравана на вырашэнне асноўных задач узаемадзеяння дзяржаўных органаў

(арганізацый) і грамадзянскай супольнасці” (арт. 1). Паўнамоцтвы па пацвярджэнні наяўнасці ў суб’ектаў грамадзянскай супольнасці права на ўзаемадзеянне з дзяржаўнымі органамі (арганізацыямі) у асаблівых формах прадастаўлена Міністэрству юстыцыі Рэспублікі Беларусь (ч. 1 арт. 7 Закона ад 14.02.2023 г.), у тым ліку такога, як абранне дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу. 22 мая 2023 г. на сайце Міністэрства юстыцыі з’явіўся пералік суб’ектаў грамадзянскай супольнасці, якія маюць права на ўзаемадзеянне з дзяржаўнымі органамі (арганізацыямі) у асаблівых формах: рэспубліканскае грамадскае аб’яднанне “Белая Русь”, Беларускае грамадскае аб’яднанне ветэранаў, грамадскае аб’яднанне “Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі”, грамадскае аб’яднанне “Беларускі саюз жанчын”, Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі [17].

Якое месца новы Усебеларускі народны сход зойме ў сістэме ўлады сучаснай беларускай дзяржавы? Якія функцыі, не рэалізаваныя раней існуючымі вышэйшымі органамі ўлады будзе выконваць? Паўнамоцтвы гэтага новага канстытуцыйнага органа, паводле арт. 12 Закона ад 7.02.2023 г., досыць шырокія. Наколькі эфектыўнай будзе яго дзейнасць – гаварыць рана, пакажа час. Хочацца пажадаць УБНС стаць сапраўдным органам *НАРОДАЎЛАДДЗЯ*, унікальным прыкладам на поставецкай прасторы.

## Спіс выкарыстаных крыніц:

1. Выдвижение делегатов в ВНС начнется с 12 марта 2024 года [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://pravo.by/novosti/obshchestvenno-politicheskie-i-v-oblasti-prava/2023/november/76033/. – Дата доступа: 09.03.2024.

2. Гигин, В. На основе традиций и права [Электронный ресурс] / В. Гигин // Беларус. думка. – 2010. – № 10. – Режим доступа: https://beldumka.belta.by/isfiles/000167_203087.pdf. – Дата доступа: 22.02.2024.

3. Гигин, В. Ф. Народное представительство как часть белорусской политической традиции [Электронный ресурс] / В. Ф. Гигин // Социология. – 2015. – № 3. – Режим доступа: https://elib.bsu.by/bitstream/123456789/162155/1/14-24.pdf. – Дата доступа: 22.02.2024.

4. Крупейченко, М. А. Эволюция института народного представительства в Беларуси : исторические и конституционно-правовые аспекты / М. А. Крупейченко // Динамика правоустановления и правореализации в сфере публично-правовых отношений : сб. науч. ст. / Нац. центр законодательства и правовых исслед. Респ. Беларусь. – Минск, 2022. – Вып. 4. – С. 72–78.

5. Пічэта, У. І. Гісторыя Беларусі / У. І. Пічэта. – Мінск : Выд. Цэнтр БДУ, 2005. – 179 с.

6. Штыхаў, Г. В. Усходнеславянскае веча і погляд на яго М. В. Доўнар-Запольскага / Г. В. Штыхаў // Трэція Міжнародныя Доўнараўскія чытанні,

Рэчыца, 14–15 верасня 2001 г. / Гомел. дзярж. ун-т ; рэдкал. : В. М. Лебедзева (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2002. – С. 139–143.

7. Доўнар, Т. І. Народаўладдзе ў Беларусі ў старажытны перыяд / Т. І. Доўнар // Традиции и инновации в праве : материалы междунар. науч.-практ. конф., посвящ. 20-летию юрид. фак. и 50-летию Полоц. гос. ун-та, Новополоцк, 6–7 окт. 2017 г. : в 3 т. / Полоц. гос. ун-т ; редкол. : И. В. Вегера (отв. ред.) [и др.]. – Новополоцк, 2017. – Т. 1. – С. 110–115.

8. Сільчанка, М. У. Ад князя і Веча да вялікага князя, сейма і Магдэбургскага права / М. У. Сільчанка // Проблемы законности и правопорядка в Республике Беларусь : материалы Респ. науч.-практ. конф., Новополоцк, 25–26 мая 2000 г. / Полоц. гос. ун-т ; редкол. : А. А. Головко (гл. ред.) [и др.]. – Новополоцк, 2000. – С. 3–4.

9. Доўнар-Запольскі, М. В. Гісторыя Беларусі / М. В. Доўнар-Запольскі ; пер. з руск. Т. М. Бутэвіч, Т. М. Кароткая, Е. П. Фешчанка. – Мінск : БелЭн, 1994. – 510 с.

10. Алексеев, Л. В. Полоцкая земля : (очерки истории Северной Белоруссии) в IX–XIII вв. / Л. В. Алексеев. – М. : Наука, 1966. – 295 с.

11. Цемушаў, С. М. Веча ці князь: праблема арганізацыі кіравання ў Полацкай зямлі X – пачатку XIII ст. у дарэвалюцыйнай і савецкай гістарыяграфіі / С. М. Цемушаў // Беларус. гіст. часоп. – 2012. – № 12. – С. 14–21.

12. Штыхов, Г. В. Древний Полоцк (IX–XIII вв.) / Г. В. Штыхов. – Минск : “Наука и техника”, 1975. – 136 с.

13. Орловская, Е. И. Зарождение идей парламентаризма в Великом Княжестве Литовском / Е. И. Орловская // Конституция Республики Беларусь как ценностный выбор : 25 лет свершений и преобразований : сб. ст. Респ. науч.-практ. конф., Минск, 4 марта 2019 г. / Белорус. гос. ун-т [и др.] ; редкол. : Г. А. Василевич (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 2019. – С. 297–299.

14. Канчер, Е. С. Белорусский вопрос : сборник статей / Е. С. Канчер. – Петроград : Белорус. отд. ком. по делам национальностей, 1919. – 132 с.

15. Доўнар, Т. І. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі : падручнік / Т. І. Доўнар; 2-е выд., выпр. і дап. – Мінск: “Адукацыя і выхаванне”, 2021. – 432 с.

16. Пастухов, М. О легитимности и пользе собрания [Электронный ресурс] / М. Пастухов. – Режим доступа : www.sn-plus.com/2016/07/09/o-legitimnosti-i-polze-sobraniya/&ved=2ahUKEwj77sysp-CFAxXi9wIHHfjqB-QQFnoECBQQAQ&usg=AOvVaw3QzTumBDrG_m5cAezeYNLG. – Дата доступа : 25.05.2020.

17. Об отнесении общественных организаций к субъектам гражданского общества [Электронный ресурс] // Министерство юстиции Республики Беларусь. – Режим доступа: https://minjust.gov.by/press/news/politicheskie_partii_obshchestvennye_obedineniya_i_drugie_nekommercheskie_organizatsii/ob_otnesenii_obshchestvennykh_organizatsiy_k_subektam_grazhdanskogo_obshchestva/. – Дата доступа: 10.02.2024.